# «Кліча мяне слова»

**Гэты дзень сабраў чытачоў, сяброў, прыхільнікаў творчасці таленавітай паэткі, празаіка, чые творы напоўнены святлом і жыццёвай мудрасцю, Галіны Іосіфаўны Лазіцкай. Творчы літаратурны вечар «Кліча мяне слова», які гасцінна прыняў Пінкавіцкі СДК, быў прысвечаны юбілею пісьменніцы.**

Найвялікшы дар асаблівага ўспрымання наваколля дастаўся Галіне Іосіфаўне ад пары дзяцінства. Але часам праходзяць гады, перш чым гэты дар прарасце сапраўднымі вершамі. Вершы Галіны Іосіфаўны друкуюцца ў газетах і часопісах. Яе творы – невычэрпная крыніца духоўнага хараства. І многія з іх адзначаны ўзнагародамі.

Некаторыя вершы паэтэсы пакладзены на музыку. На творчым вечары ў выкананні Ігара Лохача гучала песня «Кліч жыцця», а песню «Купалінка» на словы Галіны Іосіфаўны выканаў Анатоль Козіч.

«Аўтары і чытачы, – кажа Галіна Лазіцкая, – гэта ланцужок адной жыццёвай сцяжынкі, куды маўкліва ды настойліва кліча слова». Вынікам духоўных творчых пошукаў стала яе першая кніга «Прайсці поруч». Доктар філалагічных навук Ганна Кулеш зрабіла па гэтай кнізе аналіз, які надрукаваны ў часопісе «Роднае слова».



Кранальныя словы ў адрас Галіны Лазіцкай прагучалі ад іерэя Аляксандра Сыцэвіча.

Галіна Іосіфаўна ў сваім выступленні на творчым вечары распавяла, як паклікала яе слова, уклаўшы ў душу жаданне пісаць. З вялікай удзячнасцю яна ўспамінала ўсіх, хто быў побач у час станаўлення яе як пісьменніцы. Шчырую падзяку яна адрасавала і Пінскай раённай бібліятэцы імя Яўгеніі Янішчыц, якая сабрала пад сваё крыло мясцовых літаратараў. Менавіта тут ужо больш за 5 год дзейнічае клуб літаратараў «Пінчукі», члены якога і прыйшлі павіншаваць калегу па пяру з яе творчай падзеяй.

Многа цёплых слоў і пажаданняў гучала на гэтай сустрэчы. З прывітальным словам выступіла дырэктар дзяржаўнай установы культуры «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Вольга Антанчук і пажадала Галіне Іосіфаўне творчых поспехаў.

Асабліва кранальна гучалі віншаванні настаяцеля храма святых благаверных Пятра і Феўроніі іерэя Аляксандра Сыцэвіча. А хор гэтага храма, удзельніцай якога з'яўляецца Галіна Лазіцкая, выканаў музычныя творы. Святочны настрой падтрымалі музычнымі падарункамі народны фальклорны аўтэнтычны калектыў «Крыніцы» Пінкавіцкага СДК і самадзейныя артысты Пінскага раёна.

**По інфармацыі Пінскай раённай бібліятэкі ім. Я. Янішчыц**